Актуальна

**Экс-суддзя Томаш ШМІТ:**

# «УРАД ПОЛЬШЧЫ АБСАЛЮТНА НЕ ЦІКАВІЦЬ, ШТО БЫЎ ПАРУШАНЫ ШЭРАГ ЗАКОНАЎ»

**Былы польскі суддзя Томаш Шміт, які быў вымушаны з'ехаць у Беларусь, спрабаваў падаць дакументы аб парушэнні сваіх правоў у Пасольства Польшчы, аднак там адмовіліся іх прыняць. Нагадаем, былы суддзя з Варшавы раней на прэс-канферэнцыі ў Мінску заявіў, што асцерагаецца пераследу польскіх спецслужбаў, просіць палітычнага прытулку ў Беларусі і адмаўляецца ад статусу суддзі.**

Сярод падрыхтаваных Томашам Шмітам дакументаў — заявы на імя міністра юстыцыі і на імя генеральнага пракурора, пісьмо на імя амбудсмена, дзе гаворыцца, што польскі ўрад парушыў шэраг законаў, у тым ліку польскую канстытуцыю, унутраныя законы краіны і міжнародныя законы. У тым ліку і Канвенцыю па правах чалавека.

— Консул сказаў, што не можа прыняць гэтыя дакументы і не можа са мной размаўляць. Я спытаў наўпрост: «У вас ёсць забарона ад польскіх улад? Напрыклад, ад міністра Сікорскага?» Ён ад мяне адвярнуўся і ўвайшоў у ліфт. Мне засталося толькі ўкінуць дакументы ў паштовую скрыню. Гэта было няпроста, бо паштовая скрыня аказалася закрытая. У мяне нейкім чынам атрымалася ўкінуць гэтыя заявы, але я не ведаю, якая будзе рэакцыя ад польскага ўрада. Я баюся, што іх проста выкінуць у сметніцу, і на гэтым усё скончыцца, — расказаў Томаш Шміт.

Адна з прычын такой рэакцыі — тое, што польскія ўлады загадзя ахрысцілі экс-суддзю шпіёнам.

— Я звярнуўся да міністра юстыцыі і генеральнага пракурора (у Польшчы гэтыя пасады сумяшчае адзін чалавек) з просьбай аб наглядзе за гэтай справай. Не ведаю, які будзе вынік і эфект, бо паважаны міністр Адам Боднар у польскіх медыя ўжо назваў мяне беларуска-расійскім шпіёнам. Гэтак жа, як і міністр Сікорскі назваў мяне шпіёнам яшчэ да таго, як прад'явіць абвінавачванні. У нармальнай дэмакратычнай краіне міністр замежных спраў пасля такіх слоў павінен быць неадкладна адхілены ад сваёй пасады. А тут мы маем справу з сітуацыяй, калі консул атрымаў забарону на кантактаванне са мной, і мне здаецца, гэта была забарона ад міністра Сікорскага, — падзяліўся Томаш Шміт.

Больш за тое, у Польшчы ўжо выдадзены ордэр на арышт экс-суддзі, рыхтуецца і еўрапейскі ордар на арышт.

— Урад Польшчы абсалютна не цікавіць, што быў парушаны шэраг законаў. Мяне пазбавілі права на абарону, справядлівага разгляду маёй сітуацыі. Ужо выдадзены ордар на мой арышт і былі выстаўлены супраць мяне абвінавачванні. Ёсць загад аб маім арышце. Рыхтуюць таксама і еўрапейскі ордар аб арышце. Мая віна заключалася толькі ў тым, што я падаў заяву аб адстаўцы і меў на гэта поўнае права. І пачаў размаўляць з медыя, а былі гэта беларускія і расійскія медыя. У разуменні польскага ўрада гэта шпіянаж.

Што датычыцца польскіх СМІ, то яны проста адмовіліся размаўляць з былым суддзёй.

— Дзе дэмакратыя і свабода слова? Дзе свабода выяўлення сваіх поглядаў, свайго меркавання? — задаецца пытаннямі экс-суддзя. — З вялікіх польскіх медыя ніхто са мной не захацеў размаўляць. Я напісаў, што я гатовы да дыялогу, але ўжываю, анлайн, каб не было ніякіх маніпуляцый, бо я не давяраю польскім медыя, яны напішуць тое, што ім выгадна. Ніхто з польскіх СМІ не пагадзіўся на анлайн-інтэрв'ю.

Няма сувязі ў Томаша Шміта і з пракуратурай, ніякіх абвінавачванняў напрамую ён так і не атрымаў:

— У маім выпадку ніхто мне не патлумачыў, якія абвінавачванні супраць мяне, на падставе якіх матэрыялаў, хоць сувязь са мной не з'яўляецца праблематычнай. Ёсць каналы, я адкрыты ў медыя. Пракуратура магла б удакладніць, на які адрас выслаць, але нічога такога не зрабілі. На самай справе я зусім не разумею, у чым мяне абвінавачваюць, чаму быў выдадзены ордар на мой арышт. Гэта як у кнізе Кафкі «Працэс»: чалавек не ведае, у чым ён вінаваты, але яго ўжо абвінавацілі.

Томаш Шміт лічыць, што такім чынам былі перш за ўсё парушаны яго права на абарону і права на справядлівае судовае разбіральніцтва.

— Правялі такі «капюшонны» суд, бо ў чым мяне абвінавачваюць, я магу даведацца, толькі арыентуючыся на тое, што пішуць польскія СМІ. Я хачу дабівацца сваіх правоў і на нацыянальным узроўні, і на еўрапейскім, — заявіў Томаш Шміт.

Таксама ён адзначыў, што атрымлівае ад суайчыннікаў словы падтрымкі, хтосьці нават называе яго героем, але ёсць і такія людзі, якія жадаюць яму смерці і пагражаюць. Аднак у Мінску былы польскі суддзя адчувае сябе ў бяспецы. У найбліжэйшы час пасля кансультацыі з юрыстамі ён плануе падаць прашэнне да беларускіх улад аб прытулку. Калі ёсць юрыдычная магчымасць, экс-суддзя хацеў бы атрымаць беларускае грамадзянства, адначасова захаваўшы і польскае.

**Алена КРАВЕЦ.**

Разумныя грошы

# ЦЯПЕР ЗНЯЦЬ НАЯЎНЫЯ МОЖНА НА КАСЕ КРАМЫ

## Пункты продажаў падключаюцца да сэрвісу па выдачы наяўных ад Беларусбанка

**Калі вы жывяце ў населеным пункце, у якім да 20 тысяч чалавек, і карыстаецеся наяўнымі — гэтая навіна для вас. Цяпер, каб зняць грошы з карткі, ужо неабавязкова шукаць банкамат. Дастаткова звярнуцца ў найбліжэйшы гандлёвы пункт і пашукаць на касе спецыяльную налепку з зялёным кашальком — абазначэнне эквайрынгу ад гэтага банка. Яна азначае, што крама падключана да сэрвісу выдачы наяўных і тут вы можаце атрымаць неабходную суму грашовых сродкаў.**

На дадзены момант умовы зняцця наяўных такія. Сума ў рамках адной аперацыі не павінна перавышаць 5 базавых велічынь (200 рублёў). Па картках Беларусбанка камісія за зняцце наяўных не спаганяецца.

Як нам паведамілі ў прэс-службе найбуйнейшай фінансавай установы, у Год якасці Беларусбанк працуе над тым, каб грашовыя паслугі былі даступныя ў кожным кутку краіны. Сёння ў сельскай мясцовасці і гарадах з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек да сэрвісу падключана каля 2300 магазінаў. З моманту ўкаранення сэрвісу ў 2020 годзе ўжо праведзена больш за 315 000 аперацый на агульную суму 22 мільёны рублёў.

Адзначаецца, што сэрвіс зручны не толькі пакупнікам, але і ўладальнікам юрыдычных структур. Пасля падключэння суб'екты гаспадарання павялічваюць тавараабарот за кошт прыцягнення дадатковых пакупнікоў, а таксама яны скарачаюць час на здачу выручкі і выдаткі на інкасацыю грашовай наяўнасці.

Бо эквайрынг з выдачай наяўных — гэта такі від паслугі, згодна з умовамі дагавора якога арганізацыя гандлю (сэрвісу) можа ажыццяўляць аперацыі з выкарыстаннем плацежных картак, звязаныя не толькі з рэалізацыяй тавараў, работ (паслуг), але і выдаваць наяўныя грашовыя сродкі ў беларускіх рублях трымальнікам картак банка і банкаў-рэзідэнтаў.

І яшчэ. Беларусбанк не спаганяе камісію за зняцце наяўных у такіх выпадках. За праведзенне дадзенай аперацыі можа спаганяцца плата банкамі, якія выпусцілі картку. Бо пры падключэнні сэрвісу па выдачы грошай у арганізацыях гандлю прымаюцца карткі ўсіх беларускіх банкаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**


Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Ленина, 46. УНП 100868495 |

**Предмет аукциона** (одним лотом)
**Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

**ЛОТ № 1**

Производственная база в составе: **производ. корпуса** (1130,5 кв. м, 500/С-49698; 4340,5 кв. м, 500/С-53224), **диспетчерская** (54,7 кв. м, 500/С-53818), **здание специализир. иного назначения (литейный цех)** (7664,8 кв. м, 500/С-47329), **компрессорная** (473,6 кв. м, 500/С-54017), **электропечь термическая** (39,8 кв. м, 500/С-54018), **здание весовой** (24,3 кв. м, 500/С-54019), **административно-хоз. корпус** (2323,4 кв. м, 500/С-49697, составные части: проезды, площадки, подкран. путь, дорожки, подпор. стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница), **склад** (2328,4 кв. м, 500/С-53297), **склады** (895,5 кв. м, 500/С-53808), **склады, гаражи** (453,6 кв. м, 500/С-53897), **склады, администрат. помещения, агрегатные** (563,7 кв. м, 500/С-53846), **инженерный корпус** (3348,6 кв. м, 500/С-46093), **административно-производ. корпус № 4** (19710,5 кв. м, 500/С-53638), **склад** (2193,5 кв. м, 500/D-708019487), **строительный цех** (507,9 кв. м, 500/С-53845), **насосная станция автоматич. пожаротушения** (194,4 кв. м, 500/С-54016), **станция очистки сточных вод** (305,1 кв. м, 500/С-54015), **градирня** (39,1 кв. м, 500/С-55130), **ливневая канализац. сеть** (1077,5 м, 500/С-1029279), **хозяйственно-питьевая водопров. сеть** (973,2 м, 500/С-1029266), **тепловая сеть** (236,7 м, 500/С-1029272). **Иное имущество, входящее в состав лота:** газопровод внутрицеховой (инв. № 12050078), внеш. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), внутриплощадочные кабельные сети (инв. № 12020085), токопровод из алюминиевых шин 3-4 корп. (инв. № 12080111), площадка для складирования песка (гравий, инв. № 11010193), склад баллонов с кислородом (инв. № 10020854), склад для хранения баллонов с аммиаком (инв. № 10020280), склад металлический (инструмент) (инв. № 10020810), склад макулатуры (инв. № 10020877), оборудование РП-2 (инв. № 13041173), конденсат. установки (инв. № 13041182, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), ТП (инв. № 13040099, 13040120), комплекты ТП (инв. № 13040082, 13040053, 13040030), комплект. распред. устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040188), лифты груз. (инв. № 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопас. (инв. № 28240071), объекты растительности: береза бородавчатая (инв. № 20054010), вишня, 4 шт. (инв. № 20054002), груша (инв. № 20010005), яблоня (инв. № 20054008), липа мелколистная, 3 шт. (инв. № 20054005), газоны, 10 шт. (инв. № 20050404)

***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га (**срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,5035 га)

**Обременения по лоту № 1:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания находятся в залоге у банка. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.
На территории лота расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота.
Покупатель одновременно с подписанием договора купли-продажи недвижимости заключает с Продавцом предварительный договор аренды на часть капитального строения, инв. № 500/С-49698 (комната № 4 (подстанция) 33,6 кв. м, и комната № 5 (подстанция) 52,0 кв. м). Договор аренды Покупатель обязуется заключить с Продавцом в течение 2-х рабочих дней с момента перехода права собственности на объект недвижимости. С предварительным договором о заключении договора аренды части капитального строения можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by.
В соответствии с градостроит. проектом детального планирования, на зем. участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекат., выставочно-музейного, музейно-просветит. назначения

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 36 922 723,27 бел. руб.**

**ЛОТ № 2**

Котельная в составе: **технологическая котельная** (здание специализир. иного назначения, инв. № 500/С-53824, 200,3 кв. м), **хозяйственно-бытовая канализационная сеть** (сооружение специализир. коммун. хозяйства, инв. № 500/С-1029277, 169,0 м), **хозяйственно-питьевая водопроводная сеть** (сооружение специализир. коммун. хозяйства, инв. № 500/С-1029269, 68,4 м). ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве долевой аренды (срок действия: по 31.03.2026) – доля: 71/1250 от об. пл. 1,7459 га

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 127 749,38 бел. руб.**

**Задаток 1 % по лоту № 1 и 10 % по лоту № 2** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB3012 0028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30 (тридцать) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

Победитель аукциона, либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,12 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 21.06.2024 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1607, ЗАО «Центр промышленной оценки». Дата и время окончания приема документов: 20.06.2024** до 17.00 по тому же адресу

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29 154-34-35. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**



ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, аукционист** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by |
| **Собственник имущества** | ОДО «ЛИК-ПАРК», УНП 391279139, 220062, г. Минск, пр-т Победителей, д. 141-59, пом. 82 |
| **Продавец** | Ликвидатор ООО «Правовая компания «АльтЮрКом», УНП 191343750, 220099, г. Минск, ул. Казинца, д. 11А, оф. Б813 |

**Предмет аукциона**

| № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | **Полуприцеп фургон тентовый WIELTON NS 3S** | 41 100,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения аукциона, информация об имуществе размещены в открытом доступе на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 5 (пяти) рабочих дней** после аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона: не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней** после аукциона. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

**Аукцион проводится в соответствии с Регламентом организации и проведения публичных торгов в форме аукциона по реализации имущества и имущественных прав ООО «Индустрия Инноваций», размещенном по адресу:** https://iin.by

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену предмета аукциона на 5 %, обязан возместить организатору аукциона затраты на их проведение и оплатить аукционисту вознаграждение в размере **3 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит до 100 тыс. белорусских рублей, 2 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит от 100 тыс. до 500 тыс. белорусских рублей в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время проведения аукцион:** 19.06.2024, начало аукциона: 10.00, окончание аукциона: 16.00, по адресу: 220002, г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Заявки на участие в аукционе принимаются с 18.05.2024 по 18.06.2024 г. до 16.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |